***Ю.А. Грынько***
БДЭУ (Минск)

# МІКАЛАЙ РАДЗІВІЛ ЧОРНЫ – НЕКАРАНАВАНЫ УЛАДАР ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОУСКАГА

Мікалай Радзівіл з’яўляўся адным з найвыдатнейшых дзеячаў Беларуска-Літоўскай дзяржавы XVI стагоддзя. Сваю мянушку Мікалай Радзівіл Чорны атрымаў з-за колеру сваёй барады, чым адрозніваўся ад свайго стрыечнага брата, гетмана вялікага Мікалая Радзівіла Рудога. Мікалай Радзівіл Чорны адначасова займаў пасады маршалка земскага, старасты берасцейскага, ковенскага, барысаўскага і шавельскага і канцлера Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ).

Мікалай Радзівіл паходзіў са старажытнага роду Радзівілаў, які ўжо ў XVI ст. «заняў, бадай, першае месца сярод магнацкіх родаў ВКЛ па магутнасці, колькасці маёнткаў і палітычным уплыве». Пасля смерці Яна Мікалая Радзівіла Барадатага (бацьці Мікалая Радзівіла) паводле рашэння караля польскага і вялікага князя Жыгімонта Старога Мікалай Радзівіл, яго брат Ян і сястра Барбара былі ўзяты для выхавання на каралеўскі двор ў Кракаў. Там жа, пры каралеўскім двары, Мікалай Радзівіл Чорны і атрымаў хатнюю адукацыю. З ранняга дзяцінства ён сябраваў з Жыгімонтам Аўгустам, які ў 1548 г. пасля смерці бацькі, Жыгімонта Старога, заняў і польскі, і беларуска-літоўскі трон. Мікалай Радзівіл Чорны з’яўляўся правай рукой караля, таму меў непасрэдны ўплыў як на ўнутраную, так і на знешнюю палітыку дзяржавы.Жыгімонт Аўгуст ажаніўся з Барбарай Радзівіл (стрыечнай сястрой Мікалая Радзівіла Чорнага), што, зразумела, яшчэ больше зблізіла Чорнага з каралём, і 26 снежня 1550 г. Мікалай Радзівіл Чорны атрымаў пасаду канцлера ВКЛ. Фактычна канцлер стаў кіраваць справамі Беларуска-Літоўскай дзяржавы, бо Жыгімонт Аўгуст весь час знаходзіўся ў Польшчы.

Мікалай Радзівіл Чорны заўсёды адстойваў інтарэсы ВКЛ, рабіў усё дзеля таго, каб захаваць яго самастойнасць. Восенню 1551 г. на сойме ў Вільне Мікалай Радзівіл Чорны рашуча выступіў супраць дзяржаўнай уніі з Польшай, і

Жыгімонт Аўгуст падтрымаў яго. У 1553 г. Мікалай Радзівіл Чорны адпраўляецца ў Вену на перагаворы з габсбургскім дварам, каб не дапусціць саюз паміж Германскай імперыяй і Маскоўскім царствам, заключэнне якога пагражала ўсходнім межам ВКЛ.

Пачынаючы з 1556 г. Мікалай Радзівіл Чорны імкнуўся пашырыць тэрыторыю дзяржавы за кошт зямель Лівоніі. Аб гэтых тэрыторыях таксама марыла Рускае царства. У 1558 г. пачалася Лівонская вайна, у якой ВКЛ падтрымала Лівонскі ордэн. У 1561 г. ордэн распаўся і неўзабаве быў падпісаны акт аб парадкаванні Лівоніі сумесна ВКЛ і Польшчы. Мікалай Радзівіл Чорны быў прызначаны адміністратарам Лівоніі, у сувязі с чым яго уплыў ўзмацніўся яшчэ больш. У 1961 г. пасля ад’езду Жыгімонта Августа ў Польшчу, Мікалай Радзівіл Чорны быў прызначаны намеснікам князя ў ВКЛ з правам прызначаць чыноўнікаў на вышэйшыя дзяржаўныя пасады.

Што тычыцца ўнутрыдзяржаўных спраў, то дзякуючы намаганням Мікалая Радзівіла Чорнага была праведзена судова-адміністрацыйная рэформа. 1 ліпеня 1564 г. быў выдадзен Бельскі прывілей, згодна з якім утвараліся шляхецкія саслоўныя суды, якія былі аддзелены ад вялікакняжецкай адміністрацыі на месцах. Абмежавалася ўлада магнатаў, шляхта фактычна выходзіла з іх падпарадкавання. Потым была праведзена павятовая рэформа, у выніку якой былі створаны новыя органы мясцовага самакіравання – павятовыя соймікі.  Трэба адзначыць, што Мікалай Радзівіл Чорны ,таксама, прымаў удзел у падрыхтоўцы Статута ВКЛ 1566 г. Пад яго наглядам з 1551 г. пачала працаваць статутная камісія, якая распрацоўвала юрыдычныя нормы і лепш сістэматызавала матэрыял у параўнанні з тэкстам Статута 1529 г. У тэксце Статута 1566 г. былі адлюстраваны вынікі адміністрацыйна-судовых рэформаў, замацоўваліся юрыдычныя прынцыпы нацыянальнага права. Усё гэта спрыяла таму, што абмежаванне прывілееў магнатаў і  ўлады вялікага князя прывелі да кансалідацыі феадальнага саслоўя ў краіне, а гэта дало магчымасць дзяржаве выстаяць у цяжкія годы Лівонскай вайны.

Мікалай Радзівіл Чорны – годны сын беларускай зямлі. На працягу ўсяго свайго жыцця ён імкнуўся, каб ВКЛ стала цалкам незалежнай дзяржавай, імкнуўся перашкодзіць гвалтоўнаму апалячванню беларускіх і літоўскіх зямель. Яго дыпламатычнымі здольнасцямі, вострым розумам і дзіўнай дальнабачнасцю захаплялася ўсё яго акружэнне, у тым ліку і вялікі князь Жыгімонт Аўгуст. Вітаўт Чаропка падкрэслівае, што «упершыню ў гісторыі Літвы з'явіўся чалавек, які, надзялены вялікай уладай, вырашыў дзяржаўныя справы не сілай, а згодай, не зброяй, а словам, не вайной, а мірам».